# Такім ён быў даскану...

*Источник публикации:*
Дземіновіч, А. Такім ён быў даскану... / А. Дземіновіч ; фота // Гродзенская праўда. – 2000. – 15 красав. – С. 6.

Незабыўны наш Аляксей Карпюк, няўрымслівы, імпульсіўны, неспатолены і рэдка калі спакойны, добры і злы, гаваркі і маўклівы, але заўсёды аптымістычны і нераўнадушны да жыцця і людзей, нашых сучаснікаў, якія і былі героямі яго твораў вялікіх і малых, кшталту мініяцюр. Сёння можна многа згадваць пра ўсё гэта...

Па доўгу сваёй працы на радыё я часта спатыкаўся і гутарыў з Аляксеем Нічыпаравічам не толькі як з пісьменнікам-празаікам, які ўзначальваў абласное аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі але і ветэранам вайны, страсным публіцыстам і актыўным змагаром з рознымі адмоўнымі з'явамі ў нашым жыцці. Старэйшыя радыёслуха-чы, пэўна, памятаюць нашы гутаркі ў эфіры аб праблемах горада, яго вобліку, забудове, вуліцах і транспарце, парадку і паводзінах гараджан.

Асабліва хвалявала майго суразмоўцу наша моладзь, яе вучоба і выхаванне, маральны і духоўны воблік, адносіны да жыцця. Усе гэтыя пытанні і сёння актуальныя.



На здымку: В.Быкаў,А.Карпюк, П.Броўка, С.Грахоўскі ў 60-я гады



На здымку: А.Карпюк з беларускімі пісьменнікамі